Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў; рэдкал.: Ю. П. Бондар (старш.) [і інш.]. – Мінск: БДУКМ. 2014. – С. 110–114.

2. Габрусь, Т. В. Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына = Сакральное зодчество Беларуси: 1000-летнее наследие = The Sacral Architecture of Belarus : Millennial Legacy / Т. В. Габрусь. – Мінск: Беларуская навука, 2014. – 483 с.

3. Путин назвал Россию отдельной цивилизацией [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://rg.ru/2020/05/17/putin-nazval-rossiiu-otdelnoj-civilizaciej.html – Дата доступа : 24. 10. 2020.

4. Купала, Я. Вера і нацыянальнасць / Я. Купала // Збор твораў : у 7 т. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – Т. 7. – С. 212–213.

5. Соглашение о сотрудничестве между Республикой Беларусь и Белорусской православной Церковью [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://exarchate.by/resource/Dir0009/Dir0015. – Дата доступа : 24. 10. 2020.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

УДК 271.2(476)-9-536.42

**С. А. Чаропка**
ГДУ імя Ф. Скарыны, г. Гомель

# ЗНАК КРЫЖА Ў ПРАВАСЛАЎНАЙ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСАЎ

*У прадстаўленым артыкуле разглядаецца пытанне аб адным з найбольш відавочных элементаў культавай практыкі – знаку крыжа (крестномъ знаменіи) і прычынах яго эвалюцыі на тэрыторыі Беларусі. У выніку даследавання аўтар прыходзіць да высновы пра спецыфіку часу і абставін эвалюцыі крыжовага знамення сярод беларускага праваслаўнага насельніцтва ў параўнанні іншымі рэгіёнамі кананічнай тэрыторыі Рускай Праваслаўнай Царквы.*

На сённяшні дзень у Беларусі зарэгістравана 25 рэлігійных канфесій і напрамкаў, агульная іх колькасць на 1 студзеня 2020 г. складае 3563, уключаючы рэлігійныя арганізацыі і 3389 рэлігійныя абшчыны [1]. Закон Рэспублікі Беларусь “Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях” асабліва вылучае вызначальную ролю

"Праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа" [2]. У пагадненні аб супрацоўніцтве паміж урадам Рэспублікі Беларусь і Беларускай Праваслаўнай Царквой ад 2003 г. "дзяржава прызнае, што: Царква з'яўляецца адным з найважнейшых сацыяльных інстытутаў, чый гістарычны вопыт, духоўны патэнцыял і шматвяковае культурная спадчына аказалі ў мінулым і аказваюць у сучаснасці істотны ўплыў на фарміраванне духоўных, культурных і нацыянальных традыцый беларускага народа"[3].

На сённяшні дзень БПЦ царква з'яўляецца экзархатам Рускай Праваслаўнай Царквы, аднак да канца XVII ст. сітуацыя была іншай [4]. У перыяд позняга сярэднявечча і ранняга новага часу царкоўныя структуры праваслаўных беларусаў і рускіх знаходзіліся ў розных юрысдыкцыях, што было звязана з вылучэннем у 1458–1459 гг. з Кіеўскай мітраполіі асобнай мітраполіі для Вялікага княства Маскоўскага, якая атрымала адпаведную назву. Існаванне дзвюх праваслаўных, але незалежных адна ад адной цэркваў – Кіеўскай мітраполіі Канстанцінопальскага патрыярхата для беларусаў і ўкраінцаў і аўтакефальнай Маскоўскай мітраполіі для жыхароў Маскоўскай дзяржавы натуральным чынам уплывала на фарміраванне спецыфічных элементаў у многіх аспектах рэлігійнага жыцця, у тым ліку і культавай практыцы.

Гэты царкоўна-адміністрацыйны раскол наспяваў яшчэ з пачатку XIV ст. і быў абумоўлены глыбіннымі геапалітычнымі зменамі ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне. Найбольш дакладныя звесткі аб стварэнні асобнай для ВКЛ мітраполіі з цэнтрам у Наваградку адносяцца да 1317 г., калі ў актах канстанцінопальскага сінода сустракаецца подпіс літоўскага мітрапаліта Феафіла [5, p. 72, 143, 147; 6, s. 47]. У 1355 г. літоўскім мітрапалітам стаў Раман, у той час, калі ў Маскоўскай Русі царкву ўзначальваў Алексій. Паміж абодвума мітрапалітамі пачалася барацьба за Кіеўскую кафедру, вынікам якой стала ўзаконьванне патрыярхам Калістам існаванне дзвюх царкоўных структур на Русі. За Раманам было замацавана тры літоўскіх дыяцэзіі (Малога Ноўгарада (Навагрудка), Полацка і Турава), "яшчэ і епархіі Малой Русі", а за Алексіем – Кіеў, Бранск, і Вялікая Русь [7, с. 28; 8, р. 441]. Аднак Кіеўскае княства ўваходзіла ў склад ВКЛ, таму фактычна Кіеўская мітраполія апынулася ў руках Рамана.

У канцы 1459 г. у Маскве прайшоў памесны сабор, на якім канстатавалася, што "совершилось разделение Божиих церквей



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Московской и Киевской” [9, с. 31]. Рашэнні гэтага сабора не былі прызнаныя праваслаўнымі епіскапамі ў ВКЛ, такім чынам, адбыўся канчатковы падзел Кіеўскай мітраполіі. У Маскве ўтварылася аўтакефальная царква, прадстаяцелі якой ужо карысталіся тытулам мітрапалітаў Маскоўскіх і ўсяе Русі.

Адным з цікавых пытанняў спецыфікі культавай практыкі беларускага насельніцтва з’яўляецца пытанне эвалюцыі знака крыжа – крыжовага або хроснага знамення. На сённяшні дзень у культавай практыцы БПЦ прынята траяперсце, што ва ўспрыманні пераважнай колькасці праваслаўных вернікаў Беларусі звязана з царкоўнай рэформай маскоўскага патрыярха Нікана. Аднак падобнае ўяўленне аб гісторыі распаўсюджвання гэтага віду знаку крыжа ў Беларусі з'яўляецца памылкай, якое звязана з успрыманнем царкоўнай гісторыі блізкага беларусам рускага этнасу ў якасці ўласнай гісторыі. Прыналежнасць беларускага праваслаўнага свету да Рускай Праваслаўнай Царквы на працягу апошніх 335 гадоў прывяла да выцяснення з памяці спецыфікі ўласнай царкоўнай гісторыі і да атаесамлення з царкоўнай гісторыяй Расіі.

Адным з першых спосабаў здзяйснення знаку крыжа было адзінаперсце – імітацыя знака крыжа вялікім альбо ўказальным пальцам на чале. Каля 200 г. адзін з найбольш вядомых раннехрысціянскіх пісьменнікаў, багасловаў і апалагетаў Тэртуліян, пісаў: «Мы, хрысціяне, апячатваем наша чало знакам крыжа» [10]. Пальцам на лбе праводзілася спачатку падоўжная лінія, потым папярочная. Падобнага роду знак крыжа здзяйсняўся правай рукой не толькі на чале, але і на розных частках цела: на грудзях, вуснах, вачах, руках, плячах.

Аднак са з’яўленнем хрысціянства на Русі ў X ст. такі від крыжовага знамення не з’явіўся, таму што да гэтага часу ён практычна знік у візантыйскім абрадзе. Тым не менш, адгалоскі гэтага ранняга варыянту знаку крыжа з’явіліся ў Беларусі ў XIV ст. з пачаткам распаўсюджвання каталіцтва пасля падпісання Крэўскай уніі і выдання прывілея Ягайлы [11, s. 1–2]. У рымскім абрадзе Каталіцкага касцёла адзінаперсціе як дапаможны варыянт знаку крыжа захавалася да нашых дзён. “Малы крыж” святар робіць пры абвяшчэнні Евангелля спачатку на кнізе, а затым разам з вернікамі на лобе, вуснах і сэрцы.

Першай формай знаку крыжа, якая распаўсюдзілася на Русі, у тым ліку і на тэрыторыі сучаснай Беларусі, стала дваяперсціе. Гэты выгляд крыжовага знамення з’явіўся ў Рымскай імперыі ў IV ст.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і замацаваўся пасля Чацвёртага Халкідонскага Сусветнага сабору 451 г., стаўшы візуальным контраргументам супраць монафізіцтва ў вызнанні дваістай прыроды Хрыста. У IX ст. дваяперсце сярод праваслаўных і нестарыян неаднаразова згадваецца ў пісьмовых крыніцах [12, с. 43].

У XII–XIII ст. у Візантыі, якая з'яўлялася не толькі духоўным цэнтрам праваслаўнага хрысціянства, але і адміністрацыйным цэнтрам у дачыненні да Кіеўскай мітраполіі, на змену дваяперсцю прыйшла новая форма крыжовага знамення – трояперсце. Пытанне аб паходжанні трояперсця ў Візантыі, як і многія іншыя, застаецца дыскусійным. Існуе версія аб заходнім паходжанні дадзенай формы крыжавога знака. Насуперак умацаваўшайся ў шырокіх колах аматараў гісторыі думцы адносна высокай ступені ўніфікаванасці Каталіцкага касцёла ў сярэднявеччы, сітуацыя ў культавым плане на Захадзе ў гэты часовы перыяд выглядала абсалютна інакш. У прыватнасці, у Каталіцкім касцёле аж ды Трыдэнцкага сабора XVI ст. нароўні з рымскім абрадам суіснавалі амўрасіянскі, таледскі і іншыя абрады. Невыпадкова таму практыка ажыццяўлення крыжовага знамення ў каталіцкай Еўропе таксама была вельмі разнастайнай. У прыватнасці, адзін з самых вядомых і ў свой час магутных рымскіх біскупаў папа Інакенцій III на пачатку XIII ст. пісаў: "Рабіць знак крыжа варта трыма пальцамі ... Трэба рабіць рух зверху ўніз і справа налева ... Некаторыя, аднак, робяць знак крыжа злева направа [13, p. 75–76]. Такім чынам, відавочна, што на каталіцкім Захадзе крыжовае знаменне здзяйснялася як справа налева (што ёсць сучаснай нормай для Праваслаўнай царквы), так і злева направа (што канчаткова замацавалася ў Каталіцкім касцёле ў XVI ст.).

На Русі трояперсце з'яўляецца ў XIV ст. як вынік грэчаскага ўплыву, аднак у Літоўскай Русі і Русі Маскоўскай лёс новай формы знаку крыжа аказаўся розным. Калі на беларускіх і ўкраінскіх землях пытанне аб форме крыжовага знамення не насіла прынцыповага характару, то ў Русі Маскоўскай яно набыло веравызнаўчы характар. Першае сведчанне аб практыцы трояперсця ў Праваслаўнай царкве ВКЛ адносіцца да пачатку XV ст. У 1418 г. кіеўскі мітрапаліт Рыгор Цамблак з вялікім пасольствам наведаў Канстанцкі сабор, дзе правёў набажэнства, падчас якога ён выкарыстоўваў трояперсце [14, с. 361–370]. Наўрад ці можна сумнявацца, што пад уплывам вышэйшых іерархаў новая практыка стала паступова пашырацца ў беларуска-ўкраінскім праваслаўным грамадстве апошняга стагоддзя сярэднявечча.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Аднак у Маскоўскай Русі, Праваслаўная царква якой знаходзілася ў зацяжным канфлікце з Канстанцінопалем, які ўрэшце скончыўся абвяшчэннем аўтакефаліі, перамог кансерватыўны пункт гледжання. Траяперсце стала ўспрымацца як сімвал Фларэнтыйскай уніі 1439 г. з Каталіцкім касцёлам, якую заключыў ад імя ўсёй Праваслаўнай царквы Канстанцінопальскі патрыярх Іосіф II. На памесным Стоглавым саборы ў Маскве ў 1551 г. рускія іерархі забаранілі любую форму крыжовага знамення, акрамя дваяперсця: “Аще ли кто двема персты не благословляетъ, якоже и Христосъ, или не воображает двема персты крестного знаменіа, да будет проклят” [15, с. 133].

У той жа час на беларускіх і ўкраінскіх землях траяперсце мела не толькі распаўсюджанне, але і падтрымку з боку кіраўніцтва Праваслаўнай царквы. Кіеўскі мітрапаліт Пётр Магіла ў сваім “Православном исповедании Кафолической и Апостольской Церкви Восточной” паступным чынам апісвае знак крыжа: “Должно изображать крест правою рукою. Полагая на чело три большие перста, говори: «Во имя Отца»; потом, опустив руку в том же виде на перси, говори: «и Сына»; отселе перенося руку на правое плечо, и провождая до левого, говори: «и Святаго Духа»” [16].

Аб значным распаўсюджанні сярод праваслаўнага насельніцтва Беларусі траяперсця сведчыць і той факт, што пасля расколу ў 1596 г. Праваслаўнай царквы Кіеўскай мітраполіі на ўніятаў і дызунітаў, пытанне аб траяперсці як асноўнай формы знаку крыжа сярод уніятаў наогул не стаяла [17, с. 23–28]. Што тычыцца дызунітаў, то сярод іх гэтае пытанне было дыскусійным, але не прынцыповым. У прыватнасці Лаўрэнці Зізаній у выдадзеным у 1627 г. “Катэхізісе Вялікім”, адстойваў рацыю дваяперсця [18].

Рэформа маскоўскага патрыярха Нікана і яго паслядоўнікаў кардынальна змяніла практыку ажыццяўлення крыжовага знамення ў Маскоўскай Русі. Траяперсце рашуча ўводзілася ў культавую практыку, цвёрда, а часам і жорстка, выцясняючы дваяперсце, прыхільнікі якога падвяргаліся рэпрэсіям як з боку кананічнай царквы, так і дзяржавы. Праваслаўнага люду Беларусі гэтыя рэпрэсіі не закранулі па некалькіх прычынах. Па-першае, беларускія землі знаходзіліся ў складзе ВКЛ як складовай часткі Рэчы Паспалітай, а па-другое, яны былі ў іншай царкоўнай юрысдыкцыі – Канстантынопальскім патрыярхаце. Акрамя таго, значная частка праваслаўнага насельніцтва Беларусі ўжо ўспрыняла траяперсце і пасля пераходу пад амафор Маскоўскага патрыярха толькі ўмацавала пазіцыі апошняга.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Такім чынам, у Беларусі, у адрозненне ад Расіі, эвалюцыя формы крыжовага знамення пачалася значна раней і праходзіла ў больш мяккіх формах. Прыняцце траяперсція ў Беларусі не звязана з царкоўнай рэформай патрыярха Нікана, а стала вынікам значнага грэчаскага ўплыву на праваслаўны клір і паству Беларусі. Працяглы па часе і мяккі па форме працэс замены дваяперсця на траяперсце не спарадзілі ў Беларусі царкоўнага расколу і звязанай з ім праблемы стараабраднiцтва, і як вынік, зберагло наш народ ад шматлікіх чалавечых ахвяр.

## Спіс крыніц і літаратуры

1. Информация о конфессиональной ситуации в Республике Беларусь. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://belarus21.by/Articles/1439296790 – Дата доступа : 12. 01. 2021.

2. Закон Республики Беларусь "О свободе совести и религиозных организациях". – [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https:// normativka.by/lib/document/500073463 – Дата доступа : 12. 01. 2021.

3. Соглашение о сотрудничестве между Республикой Беларусь и Белорусской Православной Церковью. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://exarchate.by/resource/Dir0009/Dir0015/ – Дата доступа : 12. 01. 2021.

4. Устав Русской Православной Церкви. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.patriarchia.ru – Дата доступа : 12. 01. 2021.

5. Miklosisch, F., Müller, I. Acta et diplomata Graeca medii aevi. Volumen 1. Acta patriarchatus Constantinopolitani Tomus prior. – Vindobonnae, Carolus Gerold, MDCCCLX (1860). – 607 p. – [Electronic resource]. – Mode of access: http://anemi.lib.uoc.gr – Date of access : 12. 01. 2021.

6. Czaropka, S. Die Spaltung in der Metropolien von «Kiew und der ganzen Rus» / Черепко, С. Раскол митрополии Киевской и Всея Руси // Делом и истиной : сборник научных трудов, посвященный 10-летнему юбилею сотрудничества между историками университетов Беларуси и Тюбингенского университета = In Opere et Veritate : Sammelband von wissenschaftlichen Werken, gewidmet dem 10-jährigen Jubiläum der Zusammenarbeit zwischen den Historikern von weißrussischen Universitäten und der Universität Tübingen / под науч. ред. докт. ист. наук, проф. О. Б. Келлер. – Минск: РИВШ, 2019. – С. 45–54.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

7. Соловьёв, А. В. Великая, Малая и Белая Русь // Вопросы истории. – № 7. – 1947. – С. 24–38.

8. Мейендорф, И., Византия и Московская Русь: Очерк по истории церковных и культурных связей в XIV веке / И. Мейендорф. – Paris: YMCA-PRESS, 1990. – 830 с.

9. Макарий (Булгаков). История Русской Церкви. – М.: Изд-во Свято-Преображенского Валаамовского монастыря, 1996. – Кн. 4. Ч. 1: История Русской Церкви в период постепенного перехода её к самостоятельности (1240–1589). – 592 с.

10. Tertulliani liber De Corona Militis – [Electronic resource]. – Mode of access : http://www.tertullian.org/latin/de_corona.htm – Date of access : 12. 01. 2021.

11. Zbior praw litewskich od roku 1389 do roku 1529. Tudziez rozprawy sejmowe o tychze prawach od roku 1544 do roku 1563. – Poznań, 1841. – S. 1–2.

12. Голубинский, Е. К нашей полемике со старообрядцами / Е. Голубинский // Богословский вестник, издаваемый Московской духовной академией. – Апрель 1892 г. – Сергиев Посад, 2-я тип. А. И. Снегирёвой, 1892. – 72 с.

13. Innocentii papae, hoc nominae tertii. De sacro altaris mysterio. Liber II. Caput XLIIII. – Lovianii, 1566. – 203 p. – [Electronic resource]. – Mode of access : http:// De sacro altaris mysterio – Papa Innocentius (III.) – https://books.google.ru/books?id=5M87AAAAcAAJ&printsec=frontcover &hl=ru#v=onepage&q&f=false. – Date of access : 12.01.2021.

14. Успенский, Б. Этюды о русской истории/ Б. Успенский. – СПб, "Азбука", 2001. – 480 с.

15. Стоглавъ. – Казань: Въ тип. Губернскаго правленія, 1862. – 434 с.

16. Православное исповедание Кафолической и Апостольской Церкви Восточной. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://lib.pravmir.ru/library/readbook/3803. – Дата доступа : 02. 01. 2021.

17. Чаропка, С. А. Барацьба ў Праваслаўнай царкве ВКЛ па пытанні аб уніі ў канцы XVI – першай трэці XVII стагоддзя / С. А. Чаропка // Православие и современность : сборник научных статей / редкол.: Н. Н. Мезга (гл. ред.) [и др.]. – Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 2017. – 203 с.

18. Лаврентий Зизаний Тустановский]. Катехизис большой. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https:// 1slovo.sobornik.ru/ text/kathehisis/kathehisis.htm/kathehisis02.htm – Дата доступа : 12.01.2021.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ